Падведзены вынікі творчага конкурсу “Родныя мае мясціны”, прысвечанага жыццю і творчасці беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага

Кузьма Чорны стаў гонарам Цімкавіч. І вядзе людзей сюды, на радзіму класіка, дарога, каб пакланіцца яго памяці і вялікаму мастацкаму таленту. Да дня нараджэння беларускага класіка на малой Радзіме Кузьмы Чорнага ў аг. Цімкавічы ўжо стала традыцыйным праводзіць літаратурна-музычнае свята “Цімкавіцкія вытокі”. Юным талентам Капыльшчыны быў прапанаваны творчы конкурс “Родныя мае мясціны…”, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, жыццю і творчасці беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага. Конкурс праходзіў з 22 красавіка па 31 мая 2024 года.

Конкурс праводзіўся ў дзвюх намінацыях “Літаратурная творчасць” і “Выяўленчае мастацтва” у 2-х узроставых катэгорыях 10 – 14 гадоў і 15 – 18 гадоў. Удзельнікамі конкурса стала звыш - 50 канкурсантаў. Мэтай конкурса было: папулярызацыя і развіццё беларускай літаратуры, развіццё пазнавальнай цікавасці да творчасці Кузьмы Чорнага, выяўленне і заахвочванне таленавітых навучэнцаў да актыўнай творчай дзейнасці.

Хочацца адзначыць, што на конкурс былі прадстаўлены дастойныя работы. У намінацыі **“Літаратурная творчасць”** канкурсанты праявілі сябе ў напісанні сваіх асабістых вершаў, апавяданняў і эсэ, прысвечаных пісьменніку-земляку Кузьме Чорнаму. Напрыклад, вершы прысвечаныя Кузьме Чорнаму; “Талент Цімкавіцкай зямлі” Гурыновіч Дзіяна (ДУА “Мажская пачатковая школа”); “Кузьме Чорнаму” Аніфер Надзея (ДУА “Лясноўская сярэдняя школа”); «У каждого в жизни свой писатель есть» Карповіч Ганна (Капыльская дзіцячая бібліятэка); “Кузьме Чорнаму” Макаронак Маргарыта (Капыльская дзіцячая бібліятэка), “Гонар Айчыны” Новік Анастасія (ДУА “Навасёлкаўская базавая школа Капыльскага раёна”); “Тропинкой Чорного” Герасіменак Ангеліна (Капыльская дзіцячая бібліятэка); Канончык Паліна, верш “Светлае імя Кузьмы Чорнага” (ДУА “Ванелевіцкая сярэдняя школа”); апавяданні і эсэ прысвечаныя пісьменніку і родным мясцінам: «Мне легко и просто с Чорным» Карповіч Ганна (Капыльская дзіцячая бібліятэка), “Мой Чорны” Макаронак Маргарыта (Капыльская дзіцячая бібліятэка), “Шчырыя словы” Крышкевіч Дар’я (ДУА “Гімназія №1 г. Капыля”) і інш.

**Пераможцы ў намінацыі “Літаратурная творчасць” (**ўзроставая катэгорыя 10 – 14 гадоў:

1 месца - Анастасія Новік, навучэнка ДУА “Навасёлкаўская базавая школа Капыльскага раёна, - верш “Гонар Айчыны”;

2 месца - Ганна Карповіч, выхаванка Капыльскай дзіцячай бібліятэкі - апавяданне “Мне легко и просто с Чорным”;

3 месца - Анастасія Штырагрышная” – ДУА “Слабадакучынская сярэдняя школа” верш “А помнишь то горе…”.

**Пераможцы ў намінацыі “Літаратурная творчасць” ўзростковай катэгорыі 15 – 18 гадоў**:

1 месца - Дар’я Крышкевіч, навучэнка ДУА “Гімназія № 1 г. Капыля імя М.В. Рамашкі” – апавяданне “Пяшчотныя словы”;

2 месца – Улас Сацура, навучэнец ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Капыля імя Цішкі Гартнага” “Людзі – гэта самае каштоўнае, застануцца людзі – гісторыя не спыніцца і не пойдзе назад”;

3 месца – Паліна Канончык, навучэнка ДУА “Ванелевіцкая сярэдняя школа” верш “Светлае імя Кузьмы Чорнага”.

У намінацыі **“Выяўленчае мастацтва”** было прадстаўлена 36 творчых работ юных мастакоў, выкананых у розных тэхніках жывапісу. Творы прысвечаныя родным краявідам, звязаным з жыццём і творчасцю Кузьмы Чорнага, ілюстрацыям да твораў. Напрыклад, партрэт Кузьмы Чорнага намалявалі Маргарыта Мардвінава (ДУА “Цімкавіцкая сярэдняя школа ім. К. Чорнага”); Марыя Семашкевіч (Капыльская дзіцячая школа мастацтваў; Анастасія Уласовіч “Кузьма Чорны” (Жыліхаўская сярэдняя школа) і Елізавета Кавалёнак “Кузьма Чорны за работай” (Капыльская дзіцячая школа мастацтваў).

Прыемна, што удзельнікі конкурсу прыходзілі ў бібліятэку і бралі кнігі пісьменніка-земляка, і, прачытаўшы яе, прапусцілі праз сваю душу, адлюстроўваючы прачытаннае ў малюнку. Кагосьці з юных чытачоў-мастакоў кранулі героі мастацкіх твораў, а каго, апісаныя пісьменнікам, краявіды роднага краю.

Лепшымі былі прызнаны работы ў намінацыі **“Выяўленчае мастацтва”** прысвечаныя родным мясцінам (ўзростковая катэгорыя 10 – 14 гадоў):

I месца – Ганна Акула “Рэчка Мажа” (ДУА “Цімкавіцкая дзіцячая школа мастацтваў);

II месца - Кацярына Спірыдонава “Разбураны мост” (ДУА “Цімкавіцкая дзіцячая школа мастацтваў);

III месца - Віялета Лагун “Родныя мясціны” (ДУА “Семежаўская сярэдняя школа ім. М.С.Высоцкага").

Па матывах твораў пісьменніка намінацыі **“Выяўленчае мастацтва”** (узростковая катэгорыя 10-14 гадоў):

I месца - Бучык Аляксей Антонавіч “Пасля ўвязаў Алёша хлеба ў мяшок і некалькі кніжак і пакінуў нізкія хаты…” (ДУА “Капыльская ДШМ);

II месца - Давідоўская Паліна Васільеўна (ДУА “Ванелевіцкая СШ”) -“Насцечка” -“О, каб я дажыў да таго часу, калі ты будзеш вялікая”;

III месца - Шуляк Ангеліна Аляксандраўна “На пыльнай дарозе” (ДУА “Быстрыцкая СШ”).

Пераможцы ў намінацыі “Выяўленчае мастацтва” ўзростковай катэгорыі 15 – 18 гадоў:

I месца- Есман Елізавета “Родныя вобразы” (ДУА “Гімназія № 1 Копыля імя М. В. Рамашкі”, 15-18 год);

II месца- Аліна Коваль “Насцечка” (ДУА “Сярэдняя школа № 3 г. Капыля”);

III- месца – Дар’я Калодзіч  ілюстрацыя да апавядання “Насцечка” (чытач Капыльскай дзіцячай бібліятэкі).

Прыз глядацкіх сімпатый  -  Дар’я Сінкевіч “Свята-Георгіеўская царква ў вёсцы Лешня” (ДУА “Навасёлкаўская базавая школа Капыльскага раёна”).

Уручэнне дыпломаў адбудзецца 8 чэрвеня 2024 г. падчас правядзення літаратурна-музычнага свята “Цімкавіцкія вытокі”.

Вялікі дзякуй усім удзельнікам за творчы падыход і цікавасць да роднага краю  і творчасці пісьменніка-земляка.